Вряд ли следует сегодня упиваться полученным на референдуме всенародным "одобрям-с!" По поставленным вопросам поддержали бы и Кебича. а вот к итогам выборов следует присмотреться повнимательнее. Единственная партия, однозначно поддерживающая президента, Белорусское патриотическое движение во главе с генералом Анатолием Баранкевичем, — поражение все-таки потерпело. Группы поддержки Лукашенко, на которые опирался он в ходе избирательной президентской кампании, раздавлены с его же молчаливого согласия местной "вертикалью". (Так, по крайней мере, произошло с приснопамятным "Очищением" в моем родном Гродно — единственная юридически оформленная еше до второго тура группа поддержки Лукашенко фактически им же предана на поругание старым кебичевским кадрам. С очищенцами можно не соглашаться, но сочувствие они, как всякие преданные и обманутые, вызывают.)

А.Федута
"БДГ" 1995г.

ГОД с МАКЕДОНСКИМ

"Любовь с президентом" — такое название было бы более уместным для телефильма, подготовленного П.Романчуком для демонстрации по родимому ТВ в годовщину избрания первого президента Республики Беларусь. С пропагандистской точки зрения фильм — явный перебор.

Президент в разных вариантах любит повторять один тезис. Дескать, народ простит нам все — "лишь бы не было войны". И на телеэкране с ученической старательностью воспроизводятся кадры войн, идущих в некоторых дружественных Беларуси государствах.

У положительного героя должны быть враги. Так вот же они! И взору являются логотипы газет "Свабода" и "Фемида". В тот же логический ряд закономерно попадает и оппозиция. Мол, инсинуациями мешают жить и нормально работать. Автор даже назвал президента рыночником и монетаристом! Правда, оговорился, что глава государства — защитник сирых и убогих. И делает потрясающий вывод: жить в этот год стало лучше! Перебор, батенька-с, явный перебор.

В тот же вечер мы увидели и услышали интервью со "случайными прохожими". Каждый из них в той или иной мере хвалил президента, одобрял его действия, а комментарий диктора звучал так: "Как видите, общественное мнение Беларуси отличается разнообразием!". "Разнообразием" не отличается пропагандистский стиль куратора сферы публичной пропаганды В.Заметалина. Почерк тот же, что и вовремена избирательной кампании его прежнего патрона В.Кебича. Даже у доброжелателей президента такая кондовая агитка вызвала отторжение. Что уж говорить об оппонентах!

В тот же вечер мы лицезрели и встречу президента с журналистами, отобранными Управлением общественно-политической информации по принципу лояльности и предсказуемости. Видно было, что и нформационная кампания отечественных СМИ по освещению итогов "ста дней президента" не прошла даром для Александра Лукашенко. Он явно желает задать "рамку" для обсуждения результатов первого "президентского" года. Президент умело направляет ход беседы, естествен и убедителен в жестах и мимике, избегает резких оценок и суждений, конфронтационного тона и черно-белых оценок. И прежний государственный герб — это уже не "конь с мечом", а символ, "противоречащий менталитету нашего народа". И о взаимоотношениях с уходящим парламентом сказано достаточно корректно. По словам президента, активность "старослужащих" парламентариев, известие о намечаемой на осень сессии привели его в шок. Противоположная сторона нарушила достигнутое было неофициальное согласие. Власти, силы у президента достаточно, чтобы разрубить узел раз и навсегда. И народ бы это воспринял. Но есть опасение, что позже осудят. А народное мнение для президента — высший судия. Поэтому президент обещает резких движений в сторону парламента не делать. Разве что будут попытки "взбунтовать республику".

От себя заметим: среди непокорных парламентариев есть пугливые и непугливые. Пугливых можно "привабить" обещанием синекур и загранкомандировок за государственный счет. Или — не пустить в эти командировки в последний момент. Как это было сделано на прошедшей неделе с непослушным спикером.

Президент обязуется наладить общественный диалог с политическими партиями. Действительно, этой стороны в имидже "голубя мира" до сих пор недоставало. Единственный намек на некую конфронтацию прозвучал при упоминании лидера аграриев С.Шарецкого.

Говоря о двух встречах с ним, президент назвал его "господином". Известно, что слова "господин" и "товарищ" в устах президента имеют выраженную эмоционально-оценочную окраску. С.Шарецкий — амбициозный, крайне честолюбивый политик. Он уже делает недвусмысленные заявки на свой кусок от "пирога власти". Проводит публичные акции, делится планами на будущее, определяет некоторые масштабы претензий. Осторожней, господин Шарецкий! Двум медведям в одной берлоге не ужиться.

Речь президента комплиментарна. Таким он помнится мне только во время избирательной президентской кампании. Даже "частник" удостоился его похвалы. С ним работать легче и проще, чем с государствен-

ным чиновником.

В заслугу исполнительной власти президент ставит "тяжелую стабильность". Выполнен важнейший пункт предвыборной программы Александра Лукашенко — остановлена инфляция. Похвальную твердость демонстрирует президент в вопросе о льготах. Точнее, об их отмене. Раз уж высший законодательный орган не освободил страну от этого бремени, — пришлось президенту брать на себя персональную ответственность.

Интересно, что накануне годовщины президентства глава государства сделал заявление. В нем он сообщил о приостановке действия недавно принятого Указа "Об изменении порядка выплаты пенсий", который должен был вступить с силу с 1 августа т.г. Он честно признал свою персональную ошибку в связи с этим "силовым решением". Многие работающие и дееспособные пенсионеры несправедливо обижены... Новый вариант аналогичного решения (альтернатива: или пенсия, или зарплата) коснется только чиновничества, руководителей предприятий и коммерсантов. Думается, в этом случае тот "советский человек", популяция которого существует в Беларуси и ради которого президент не решается на радикальные реформы, протестовать не будет.

Логическим дополнением телебеседы президента с журналистами стало интервью А.Лукашенко, данное корреспонденту "Звязды" Ю.Свирко. И вот здесь наряду с перечислением "привычных завоеваний" президентства — борьбы с инфляцией, борьбы с коррупцией, ускорения экономической интеграции с Россией — появляются новые акценты. Как свое достижение президент отмечает "замыкание на себя" все большего круга проблем. "Сегодня уже лицензию на лес, на удобрения, на оружие никто, кроме президента, не может дать", — говорит он.

Лейтмотив личной ответственности пронизывает и телевыступление президента. Равно как и тема усиления контроля за всеми сторонами жизни общества. Добавим, что доходит до смешного. Среди абитуриентов-95 есть четкое убеждение, что темы сочинений на вступительных экзаменах в вузы в этом году им назовет лично президент в специальном обращении через электронные СМИ. Всем и сразу. Как говаривал классик: учет и контроль — вот главное для построения социализма.

И еще одно заявление из газетного интервью главы государства привлекает внимание: "В ближайшее время будет указ об окончании создания органов представительной власти на местах. Количество Советов будет сокращено: не такие уж мы богатые. Думаю, что районный, областной и верховный уровень, городские Советы типа Минского и Борисовского — нам сверхдостаточно. Все остальное — это излишняя конфронтация". А как же соответствующее решение КС?

И в заключение интервью президент с раздражением упоминает о новой журналистской мифологеме — "проблеме лидера некой объединенной державы". Он квалифицирует ее появление как желание столкнуть его "лоб в лоб с российскими политиками". И надо сказать, небезосновательно. По крайней мере, претендующая на аналитичность статья С.Наумчика "Цель", опубликованная в "Свабодзе" от 7 июля на русском (SIC!) языке, сильно смахивает на донос Виктору Черномырдину о псевдоамбициях Александра Лукашенко.

А вот об одной своей значимой реальной заслуге прошедшего года А.Лукашенко упомянуть забыл. Он остановил процесс расслоения белорусского общества на основе принципа "двухобщинности". Симптомы начала этого процесса были налицо: национально-демократическое цензурирование материалов в ведущей парламентской газете 1991—1994гг.; шельмование русского языка и ментальности русских; неявная дискриминация этнических русских при продвижении на высшие административные посты, существовавшая в последние годы (исключения делались для сторонников национальной идеи); принятие не продиктованного ситуацией законодательства по регулированию отношений в межэтнической сфере и т.д.

Оскорбленные вполне цивилизованным термином "нацменьшинство" представители второй по численности этнической группы, русские, стали объединяться в различные общества, группировки и партии. Действие рождает противодействие. Национал-демократам следовало бы основательно изучить черты ментальности этой этнической группы, прежде чем "наезжать" на ее права.

Многие из предсказывавших самоустранение первого президента с политической арены через полгода-год, мотивировали это отсутствием сыгранной команды и пропрезидентской партии. Лучше бы они поинтересовались пресловутой "пятой графой" первого, второго и третьего эшелонов членов команды.

Александр Лукашенко, бросивший в массы лозунг равенства людей независимо от национальной принадлежности, свято придерживался его и в кадровой политике. Вот почему под его знамена так охотно встали и честолюбивые, дееспособные "инородцы". В случае победы националов на длительную перспективу у этих людей и их потомства не было бы карьерного будущего. Исключение по целому ряду причин составляют ассимилированные и неассимилированные представители польского этноса.

На прошедшей неделе завершилась эпоха в формировании белорусской многопартийности, связанная с инициативной ролью в этом процессе БНФ. Есть "волновая теория" существования политических объединений. Не выполнившая своего функционального назначения организация может поймать следующую "волну эффективности" постановкой новых, жизнеспособных задач и целей. В этой связи все демократы, независимо от идеологических симпатий, большие надежды связывали со 2-й сессией IV съезда движения БНФ "Адраджэньне" и II съезда существующей юридически партии БНФ. Ибо без обновления этого "патриарха" демдвижения политическая палитра Беларуси многое утратит. Надеждам было не суждено сбыться.

Немногочисленные наблюдатели, допущенные на съезд, констатировали, что существенных, принципиальных выводов из второго за год поражения национал-демократы так и не сделали. В плане сам .критики в основном занимались "ловлей блох". Дескать, недооценили опасности референдума из-за чрезмерного внимания избирательной кампании. Рискну заметить, что победить линию президента фронтовцы могли только тактикой "удушения в объятиях", перехвата президентских лозунгов. Короче, для победы надо было загодя сменить приевшуюся избирателям личину, пойти на поводу у массовых симпатий и ценностей. Грубо

говоря, обмануть народ. А уж после победы реализовывать свои программные цели. Но при такой тактике Фронт перестал бы быть Фронтом. Как в той присказке, когда бабка стала бы вдруг дедкой.

Честная, неконъюнктурная смена имиджа возможна после поражения. И начать надо с названия. Не зря термин "Фронт" ассоциируется с войной. Например, в одном из избирательных округов Минска вся предвыборная кампания кандидатши строилась на противопоставлении названия своей партии "Надзея" именованию "Фронт". Его представлял другой претендент. Эта нехитрая схема безотказно действовала на пенсионеров, и они дружными рядами шли голосовать за совершенно неизвестную им даму. Так был выбит из седла Ю.Ходыко. Он-то и пытался реформировать организацию. Однако твердые "зеноновцы" провалили его кандидатуру на пост главы Фронта.

Ю.Ходыко в очередной раз избран замом председателя, бессменного "харизматика". Институт "замов" увеличился с двух до пяти человек. Это — Ю.Ходыко, Ю.Беленький, В.Вечорка, Л.Борщевский, С.Гусак. Новых имен нет. Нет свежего притока интеллектуальной элиты. И это страшнее, чем отсутствие притока денежных средств, о котором так много говорилось на съезде. По итогам выборов от руководства отошли некоторые видные "прагматики" и "идейные". Имена их говорят сами за себя. Это — В.Голубев, В.Ивашкевич, С.Мурох, В.Анцулевич, В.Чуйко. В.Анцулевич, руководивший избирательной кампанией, предсказал, что осенью организация откажется от участия в выборах. Большей глупости, чем "отзовизм", для политической организации трудно себе представить.

С.Артюшенко
"СН+" 1995г.

ЗАЖИВЕМ ПО-КИТАЙСКИ?

БЕЛАРУСКАЯ ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

1918-1939

Пачаткі беларускай хрысьціянскай дэмакратыі трэба шукаць у першых гадах XX ст., у той час, калі зьявіўся арганізаваны беларускі нацыянальны рух. Першапачаткова прыхільнікі хрысьціянскай дэмакратыі абмяжоўвалі сваё зацікаўленьнм справамі культурнай аўтаноміі, асабліва выкарыстаньня беларускай мовы ў касьцёле, што дазволіла бы павялічыць узьдзеяньне на вернікаў.

Вялікі ўплыў на дзячоў беларускай хрысьціянскай дэмакратыі зрабіла рэвалюцыя 1905 года. У страйках за свабоднае ўжываньне беларускай мовы ўзялі ўдзел кіраўнікі руху, між іншым, кс. Адам Станкевіч, які ўтой час працаваў у ашмянскай гарадзкой школе. Уплыў на гэты рух мела таксама стварэньне беларускімі студэнтамі Беларускай сацыялістычнай Грамады, у праграме якой былі лёзунгі аўтаноміі для беларускага народу ў межах расейскай дзяржавы, скліканьня асобнага Сойму ў Вільні, увядзеньня беларускай мовы ўшкольніцтва, а таксама правядзеньня аграрнай рэформы — зь пе́расьцярогай каб гэта адбылося эвалюцыйным шляхам. пасьля паразы рэвалюцыі 1905 года паўсталі беларускія гурткі. У 1911 годзе ў Вільні паўстаў такі гурток, аб'яднаны вакол кс. Адама Станкевіча, а годам пазьней узьнік беларускі гурток у Пецярбурскай Духоўнай Акадэміі. У першым гуртку апынуліся ксяндзы Язэп Рэшаць, М.Шалкевіч, Андрэй Цікота, Вінцэнт Лукша, Казімер Стэповіч, а таксама людзі сьвецкія: Францішак Аляшкевіч, аляксандар Аўгустыновіч, Мікалай Кавалеўскі ў Язэп Дашута. У Пецярбурзе працавалі Лявон Хвецька, кс.П.Пякарскі, Станіслаў Шырокі, кс..Франчук, кс.гнат Жаўняровіч і кс.Вінцэнт Гадлеўскі.

Праца абодвух гурткоў палягала на азнаямленьні зь беларускімі літаратурнымі творамі й іх распаўсюджваньні сярод шырокіх колаў беларускага грамадзтва.

Першая сусьветная вайна й расейскія рэвалюцыі: лютаўская і кастрычніцкая 1917 года далі магчымасьці разьвіцьця хрысьціянска-дэмакратычнага руху сярод беларусаў. У сакавіку 1917 г. на Беларускім зьезьдзе ў Менску рэпрэзэнтаваў кс. вінцэнт Гадлеўскі, які ў хуткім часе стаўсябрам Беларускага нацыянальнага камітэту. падчас віленскай беларускай канфэрэнцыі (студзень 1918 г.), у якой бралі таксама ўдзел прадстаўнікі каталікоў, было прынята патрабаваньне ўвядзеньня беларускай мовы ўКаталіцкім Касьцёле, а пасьля адпаведных кансультацый — і ў Праваслаўнай Царкве, так каб беларусы незалежна ад веравызнаньня маглі карыстацца ў сьвятыні роднай мовай. 24 жніўня 1918 г. ў Вільні пачала выходзіць газэта "Крыніца", якая стала асяродкам фармаваньня беларускага хадэцкага руху ў Польшчы.

У першай праграме гэтай групоўкі, ухваленай на зьезьдзе ў Менску ў 1920 г., было патрабаваньне пашырэньня асьветы й рэлігіі сярод беларусаў. Зьезд прызнаў прыватную ўласнасьць за "падставу цывілізацыйнага поступу грамадзтва", але дапускалася таксама і калякгыўная ўласнасьць. Было патрабаваньне памяншэньня маёнткаў абшарнікаў і падзел дзяржаўнай зямлі. У палітычных справах зьезд беларускіх хрысьціянскіх дэмакратаў дамагаўся: вольнасьці вервызнаньняў, дэмакратычных правоў і свабод, аб'яднаньня ўсіх беларускіх земляў, прва народа на самавызначэньне, правоў нацыянальных меншасьцяў, пачатковага навучаньня на беларускай мове, сьцiслага супрацоўніцтва беларусаў праваслаўных і каталікоў. Гэтая праграма спалучала асновы сацыяльнай навукі Касьцёла зь беларускім нацыянальным пытаньнем. Пачэснае мейсца заняло пытаньне аграрнай рэформы.

Грамадзкія ўплывы Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі былі ў той час невялікія. Падставовую базу партыі складала нешматлікая беларуская інтэлігенцыя. Адносна рэдка ў БХД уступалі сяляне. У Польшчы ў выбарах 1922г. партыя ўвайшла ў склад Блёка нацыянальных меншасьцяў, а кс.Адам Станкевіч атрымаў пасольскі мандат.

Два гады пазьней беларускія хадэкі стварылі арганізацыю пад назвай Беларускае Хрысьціянска-дэмакратычнае Аб'яднаньне, якое ў 1926 годзе зьмяніляа назву на Аб'яднаньне беларусаў-каталікоў. Колькасьць сяброў аб'яднаньня паступова ўзрастала, і хутка яна стала другой пасьля Грамады беларускай арганізацыяй. яе ўплывы дасягалі наступных паветаў: віленскага, троцкага, сьвянцянскага, вілейскага, ашмянскага, лідскага, дунілаввіцкага, валожынскага, Слонімскага, Лунінецкага, Ваўкавыскага, нясьвіскага і Кобрыньскага. У 1926 г. у шэрагах Аб'яднаньня працавала каля шасьцідзесяці ксяндзоў Беларусі.

У трэцім квартале 1926 г. была абвешчана новая праграма Беларускай Хрысьціянскай дэмакратыі. У параўнаньні зь менскай праграмай, у гэтым дакуманце былі досыць істотныя зьмены. Перад усім прызнана праблема падзелу зямлі між сялянамі: бяз выкупу, але з кампэнсацыяй дзяржавай ранейшым уласьнікам. Абмежаваньне валоданьня зямлёй мусіла таксама датычыцца й Касьцёла. Прызнана, што да партыі могуць належыць і праваслаўныя, бо праграма за ідэйную падставу партыі вызнала Хрысьціянства, а не Каталіцызм. У школах плянавалася праводзіць лекцыі рэлігіі згодна зь веравызнаньнем вучняў, таксама прадугледжвалася адзьдзяленьне Касьцёла ад дзяржавы. Гэта было наступствам таго факту, што сярод беларусаў былі вызнаўцы абедзьвюх хрысьціянскіх канфэсій.

Апроч таго, што праграма партыі ахоплівала амаль усе галіны жыцьця, яе практычная дзейнасьць была вельмі абмежаванай. Партыя ня мела магчымасьцяў уплываць на палітыку польскай дзяржавы, тая-ж праграма рэформ мела значэньне толькі на далейшую пэрспэктыву. У штодзённай працы стаўка рабілася на кеультурныя і асьветніцкія акцыі і ўвядзеньне ўлітургію беларускай мовы. У 1926 г. ў кампэтэнцыі хрысьціянскіх дэмакратаў апынуўся таксама Беларускі інстытут Гаспадаркі і культуры. у межах інстытута арганізоўваліся чытаньні, выдаваліся кніжкі і папулярызавалася беларуская літаратура. Шырэйшай дзейнасьці перашкаджаў пэрманэнты брак адукацыі.

Такая сытуацыя трывала да 10 сьнежня 1928г., калі віленскі арцыбіскуп Рамуальд Яблжыкоўскі выдаў ліст, скіраваны да духавенства, у якім абвінавяціў сяброў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі ў "памылках рэлігійнага індэфэрэнтызму і бальшавізму" і забараніў духоўным супрацоўнічаць з партыяй, а тым, якія да яе належылі, параіў выйсьці з БХД. Беларускі нацыянальны камітэт пратэставаў супраць узгаданага дакумента, лічачы, што ён мае палітычны, а не рэлігійны характар, а яго мэтай зьяўляецца хутчэйшая палянізацыя беларускіх земляў. БНК выстаўляў аргументы, што ліст крыўдзіць беларусаў, і ў будучыні можа стаць прычынай барацьбы паміж польскім і беларускім духавенствам.

Калі ў жніўні 1935 г. ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі зьвярнулася да хрысьціянскай дэмакратыі з прапановай супра цоўніцтва, намяраючыся стварыць антыфашыстоўскі фронт, прэзыдыюм БХД адкінуў гэтую прапанову. Становішча аргумэнтавалася наступным чынам: КПЗБ — не самастойная беларуская партыя, яна вызнае інтэрнацыялізм і падлягае КПП, прапануе ідэалёгію, спрэчную з праграмай хрысьціянскай дэмакратыі і ўрэшце прымае дыктатуру пралетарыята. прэзыдыюм БХД забараніў сябрам партыі якія-кольвек кантакты з КПЗБ.

Дыскусія на тэму аднаўленьня беларускай хадэцыі працягвалася некалькі гадоў і скрышталізавалася ў студзені 1936 г., калі была абвешчана праграма Беларускага народнага аб'яднаньня. Гэтая праграма выходзіла па-за хрысьціянска-дэмакратычную канцэпцыю. БНА захавала варожыя адносіны з камунізмам, а таксама варожыя адносіны з СССР.

Напярэдадні пачатку сусьветнай вайны, у сувязі з абвастрэньнем палітычнай сытуацыі ў Эўропе, наступіла выразнае згладжваньне антаганізмаў між беларускімі партыямі. Прадстаўнікам Партыі беларускіх нацыянал-сацыялістаў ня мела посьпеху спроба прыцягненьня хадэкаў да канцэпцыі стварэньня беларускай нацыянальнай дзяржавы пад пратэктаратам Нямеччыны. У гэты час беларускія хадэкі ня бралі пад увагу такой магчымасьці.

(у скароце)

(пераклаў з польскай *Альгерд Невяроўскі)*

Крыстына ГАМУЛКА
("Дыскусія"/"*Dyskusja*")

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫ САЮЗ: ДЗІЦЯ ДЭМАКРАТЫІ ЦІ ЦАЦКА ПРЭЗЫДЭНТА?

У задрамала-затармажаным летнім палітычным жыцьці Беларусі, бадай, найпрыкметнейшай падзеяй стала стварэньне Сацыял-дэмакратычнага саюзу. Аднак паведамленьні пра яе у асноўным абмежаваліся апісаньнем кляўнады з удзелам двух невылечных камуністаў, якія пратэставалі супраць падпісаньня міжпартыйнага пагадненьня ў доміку 1-га зьезду РСДРП. Між тым, стварэньне СДС відавочна патрабуе значна больш сур'ёзнай і глыбокай увагі.

Аб'яднаньне дэмакратычных партыяў у адну магутную арганізацыю дэмакратычная грамадзкасьць Беларусі, здаецца, павінна толькі вітаць. Па лёгіцы, згуртаваўшы намаганьні Сацыял-дэмакратычнай грамады (БСДГ), Партыі народнай згоды (ПНЗ) і Партыі усебеларускага адзінства і згоды (УАЗ), можна дабіцца большых посьпехаў.

Аднак палітычная лёгіка не заўсёды супадае з жыцьцёвай - вобразна кажучы, ад пункту "А" да пункту "Б" хутчэй будзе даехаць на адным кані, чым на трох... Да таго-ж, у жыцьці нярэдка існуе і сумнавядомы "саюз" лебедзя, рака і шчупака. Дзе гарантыя, што аб'яднаньне такіх розных па сваёй накіраванасьці, духу і маштабу партыяў не прывядзе да такога ж выніку?

"Асноўная задача новага аб'яднаньня — прыцягнуць палітычна пасіўных людзей, якія дасюль не маглі знайсьці сабе адпаведнай палітычнай сілы. Наша мэта — не адцягваць кадры ад існуючых партый, а прываблівць новыя", — гаворыць Аляксей Кароль, адзін зь лідараў ПНЗ. Паводле яго сьцьвярджэньня, галоўнае цяпер — стварыць юрыдычны перадвыбарчы блёк, каб пазьбегнуць суперніцтва цэнтрыстаў на выбарах, што, на жаль, паўсюдна адбывалася ў траўні. Кароль лічыць, што паміж "падпісантамі" няма вялікіх ідэалягічных разыходжаньняў. "Адраджэнская ідэя не чужая для ПНЗ, мы падтрымліваем суверэнітэт, але ставім яго побач з вырашэньнем сацыяльных задач".— заяўляе Кароль. Сёньня пакуль невядома, ці адбудзецца зьліцьцё ў адну партыю да лістападаўскіх выбараў.

"Пытаньне аб адзіным лідары пакуль не стаіць", — заяўляе Кароль. Аднак прысутнасьць і кароткае выступленьне на цырымоніі падпісаньня Георгія Таразевіча далі падставы для чутак, нібы менавіта гэтая асоба можа ўзначаліць СДС. Аднак сам Таразевіч сказаў мне, што ніякіх перамоў на гэты конт зь ім ніхто ня вёў. "Я падтрымліваю саму ідэю аб'яднаньня, але пакуль цяжка сказаць, што зь яе атрымаецца", — зазначыў Таразевіч. Відавочна, аднак, што пэўная частка сяброў Грамады даволі нэгатыўна ставяцца да праэкту па стварэньні адзінай сацыял-дэмакратычнай партыі. "Я быў ня супраць стварэньня перадвыбарчага блёку, пажадана разам зь іншымі дэмакратычнымі сіламі,— гаворыць былы лідар БСДГ Алег Трусаў. — Але калі зьявіліся інтэрвію наконт зьліцьця ў адну партыю, і Булахаў нават выказаў гатоўнасьць яе ўзначаліць, мы разам зь іншымі сябрамі Грамады былі проста абураныя. Відавочна, што пэўныя прэзыдэнцкія структуры распрацавалі сур'ёзную тактыку зьнішчэньня трох дэмакратычных партый — БСДГ, ПНЗ і БНФ. Раскалоць Грамаду і Згоду ім фактычна ўдалося, але на Фронце яны абламалі зубы", — сьцьвярджае Трусаў, зьвяртаючы ўвагу на той вялікі інтарэс, які чамусьці праявілі да стварэньня СДС дзяржаўныя радыё і тэлебачаньне і прапрэзыдэнцкая прэса. У той-жа час незалежныя выданьні пракамэнтавалі гэту падзею даволі іранічна. "Ды і з кім, скажыце, аб'ядноўвацца? У Грамады — паўтары тысячы сяброў, у Згодзе — некалькі сотняў, партыя Булахава — увогуле фантом, які мае толькі дзьве рэгіянальныя суполкі", — зазначае Трусаў.

"Для Грамады гэты саюз ня дасьць новых прыхільнікаў, затое можа адлучыць ад яе старыя адраджэнскія кадры. Пад шумок стварэньня СДС пэўныя сілы хочуць зьнішчыць саму Грамаду, яны адназначна маюць адзіны цэнтар і адзіную мэту",— заявіў Трусаў. Ён, аднак, пакуль не зьбіраецца ствараць якую-небудзь апазыцыйную фракцыю ў сваёй партыі. "Нават тыя, хто яшчэ на зьезьдзе Грамады не разумелі, што адбываецца, зараз бачаць, навошта спатрэбілася гэтак званае аб'яднаньне. Таму я раю сваім сябрам па партыі не рабіць ніякіх рэзкіх рухаў — людзі самі разьбяруцца. Справа ў тым, што ініцыятары СДС вельмі хутка праявяць сябе", — упэўнены былы кіраўнік Грамады.

Віталь ЦЫГАНКОЎ
"СВАБОДА", 4 жніўня 1995г.

Мікола СТАТКЕВІЧ :

У ГРАМАДЗЕ НЕ БУДЗЕ РАСКОЛУ

-Адбылося падпісанне пэўных дакументаў — і тры арганізацыі зліліся ў адзіны сацыял-дэмакратычны — саюз...

— Не, не так. Дакладна так сказаць нельга. Тры незалежныя арганізацыі — Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Партыя народнай згоды і Усебеларуская партыя адзінства і згоды — аб'ядналіся ў блок, які завецца Сацыял-дэмакратычны саюз.

— Дарэчы, чаму аб'яднанне адбывалася ў Доме-музеі І з'езда — разлік на пэўны эпатаж? Намёк на нейкую пераймальнасць?

— Безумоўна, арганізатары любой акцыі імкнуцца прыцягнуць да яе ўвагу. Але тут былі і больш глыбінныя прычыны. Я памятую, калі ўтваралася Грамада, былі прапановы (і абмяркоўваліся сур'ёзна), каб адну з Цэнтральных радаў БСДГ правесці ў гэтым доміку.

Справа ў тым, што мы існуем у эпоху міфаў — не заўсёды вытлумачальных, часцяком перакручаных. У гэтым доміку была ўтворана Расійская сацыял-дэмакратычная партыя. Было там 9 дэлегатаў. Там быў і прадстаўнік Беларусі. Потым гэтую партыю сталі зваць меньшавікамі і знішчылі. .

Адбылася жахлівая рэч: мала, што бальшавікі знішчылі ўтвораную тут партыю, праследавалі і знішчалі дэлегатаў таго І з'езда, яны яшчэ забралі іх гісторыю. Забралі іх сімвал — зрабілі сімвалам сваёй — бальшавіцкай, камуністычнай — партыі, якая столькі бедаў нарабіла і нашаму народу,і іншым.

— Шмат гаворыцца пра тое, што не паспеў Статкевіч стаць лідэрам Грамады, як адразу ўзяў на сябе цяжар такой адказнаці: з'яднанне, пераўтварэнні. Ці прыспела гэтая падзея? Ці не атрымліваецца: новая мятла ды па-свойму мяце?

— Па-першае, калі ў Грамадзе ішлі выбары кіраўніцтва, я выступаў з гэтай праграмай.

Выбары новага кіраўніка — гэта галасаванне Грамады за новую блокавую палітыку. Я пасутнасці проста рэалізую тое, што прапаноўваў. Казаць пра з'яднане і ўкладваць у гэты тэрмін самыя розныя сэнсы — не лепшы "контраргумент". Гаворка ідзе пра блок. Блок сацыял-дэмакратычных партыяў... Я лічу здрадай Беларусі амбіцыі "самастойных"лідэраў самастойных партыяў. Гэта амбіцыі дробных царкоў, якія ўпіраліся да апошняга і давялі сітуацыю да таго, што мы зараз маем.

А тыя непрадуманыя заявы, што з'яўляюцца зараз, пасля афармлення блока, трэба залічыць на эмоцыі іх аўтараў. На жаль, у нас зрабілася дурной традыцыяй — кожны адстаўны лідэр становіцца ў позу прапаведніка і пачынае палохаць расколам.

Адбылося пасяджэнне Цэнтральнай рады Грамады, і курс на стварэнне сацыял-дэмакратычнага блоку быў ухвалены.

— Вы не маглі не чытаць у "Свабодзе" перасцярогу наконт народжанага саюза: ці то ён "дзіця дэмакратыі, ці цацка прэзідэнта"?

— Я чытаў. Але я, здаецца, на гэтае пытанні ўжо адказаў. І партыя на Цэнтральнай радзе адказала таксама.

Дарэчы, напярэдадні падпісання на пясяджэнні Выканкама Грамады ўсе дакументы (у тым ліку, і пра месца падпісання), прымаліся аднагалосна. Мне дзіўна зараз чуць і чытаць тых людзей — нават не людзей, чалавека, — які сам галасаваў за гэтае рашэнне, а зараз вядзе размовы пра раскол і нейкую дыверсію.

— А тое, што вялікая колькасць былых наменклатурных асобаў зараз хіліцца да Грамады, вас не насцярожвае?

— Я думаю, што гэта — нармальная з'ява. Я памятаю, калі ўзнікаў БНФ і калі была зроблена заява, што тым, хто быў у кампартыі, нельга займаць кіруючыя пасады ў Фронце, — як гэта адштурхнула людзей, што былі вядомыя, дзеяздольныя, паважаныя ў грамадстве, няхай у час і ў межах той кіруючай сістэмы! Гэта ў тым ліку былі людзі патрыятычных поглядаў, да таго ж яны мелі вопыт кіравання, пэўныя магчымасці. У Прыбалтыцы гэты людзі ўдзельнічалі ў нацыянальным руху, яны зрабілі першыя крокі да незалежнасці. У нас пасля заявы "А вам нельга!" (ініцыіраванай, я думаю, з двух крыніцаў: з нетраў спецслужбаў ды з боку той творчай інтэлігенцыі, якой хацелася быць у героях і якая баялася, што яе адціснуць з-за пэўнай нявопытнасці, няўмення, слабыя арганізацыйныя здольнасці), хваля адразу пайшла на спад і з якімі цяжкасцямі мы зараз ідзем да незалежнасці!

Я найперш патрыёт. І Грамада, і Саюз — гэта будуць патрыятычныя арганізацыі, скіраваныя на беларускую дзяржаўнасць і адраджэнне нашай культуры. І калі зараз пад сцягі дзяржаўнасці становяцца ўсё новыя і новыя людзі — гэта вельмі слушна, вельмі добра.

— І апошняе пытанне. З вашым зыходам у Грамаду, а зараз у кіруючыя органы Саюза, ці не застанецца сіратою БЗВ?

— Казаць так — абражаць БЗВ. БЗВ — гэта не арганізацыя аднаго чалавека.

Абавязкі кіраўніка БЗВ выконвае Алесь Станкевіч, будзе з'езд, ён абярэ нейкага кіраўніка. Тут праблемы не будзе.

"Беларуская маладзёжная", 24 ліпеня 1995г.

Машына часу Аляксандра Лукашэнкі або год Марлока

Гадавыя ўгодкі прэзыдэнцтва А.Лукашэнкі нейкім дзівосным чынам саўпала са 100—гадовым юбілеям выйсьця ў сьвет славутай "Машыны часу" Гэрбэрта Уэлса. Гэтае досыць прыпадковае супадзеньне набыло нейкі фатальны сэнс у сьвятле рэфэрэндуму. Ужо сталася аксыёмай меркаваньне, што народ абраў таго каго хацеў, таго, хто найбольш поўна выражае ягоныя надзеі і чаяньні. Але нельга ня бачыць (і рэфэрэндум гэта падцьвердзіў), што у грамадзтве Беларусі існуе і адносна вялікая пластоўка людзей (прыкладна 20-ць адсоткаў), якія досыць скептычна ставяцца як да астатніх жыхароў края, гэтак і да іхняга "народного избранника". Гэты відавочны раскол грамадзкае супольнасьці патрабуе дэталёвага "разбора полётов" усяе беларускае сытуацыі наогул і аднаго зь яе галоўных чыньнікаў — прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь

Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі — у прыватнасьці. Беларуская служба Радыё "Свабода" прысьвяціла гэтаму досыць шмат свайго эфірнага часу. Зь некаторымі меркаваньнямі, якія прагучалі на хвалях РС, мы і хацелі б пазнаёміць нашых чытачоў.

Алена Радкевіч (далей— А.Р.), камэнтатарка беларускае службы РС:

— Папярэдняй глыбіннай праграмы пераўтва-рэньня краіны ў яго ня было, але ёсьць людзі паверыўшыя раз у фатальнасьць свайго лёсу, у тое, што ім наканавана зьдзейсьніць НЕШТА *(разрадка тут і далей — З.С.)*, на дасягнутым ўжо не спыняюцца. Першапа-чатковая вызначаная мэта для іх рухомая, эвалюцыйная. Дырэктар саўгасу можа захацець стаць дэпутатам, дэпутат — прэзыдэнтам, прэзыдэнт — лідарам славянскага сьвету... Ці гэтым скончыцца пералік?

Наступная паралель можа здасца неапраўдана перааццэненай, але ўзгадайма Напалеёна. Быў звычайным афіцэрам, пажадаў стаць генэралам, потым — імпэратарам Францыі, імпэратарам Эўропы. Дасягнуўшы гэтага пачаў марыць пра ўладаньне сьветам. Памятаеце, калі Банапарт, захапіўшы Эўропу, спыніўся ля межаў Расеі і рыхтаваў паход на Маскву, генэралы папярэджвалі яго аб небясьпецы падобных плянаў. Ён ім адказаў — "Я ўсё магу!". Я не хачу абвінаваціць прэзыдэнта Беларусі ў падобных глябальных амбіцыях, хачу толькі такім чынам даць ілюстрацыю псыхалягічнага стану ўпэўненых у сваёй абранасьці людзей. Але гэта магчымы цяперашні стан Аляксандра Лукашэнкі, а пачынаў ён зь іншага. Палітолягі дагэтуль ня могуць знайсьці канчатковага адказу на пытаньне — хто ён? Таленавіты самародак, геніяльны камбінатар з маскаю прастачка ці ведамая чыесьцю рукой марыянэтка? Кожнае з гэтых меркаваньняў мае аргуманты і за і супраць. Адназначна можна толькі сказаць, што прымаць ягоную вонкавую прастату за чыстую манэту — недаравальнае глупства. Народ, электарат у свой час успрыняў яго, выхадца з намэнклятуры за свайго. Вобраз змагара з карупцыяй, які меў тады старшыня парляманцкай камісыі Лукашэнка, не дазваляў сумнявацца ў яго крыштальнай сумленнасьці. Народ і не падазраваў, што гэтае змаганьне было выбарачным, што былы камсамольскі работнік, саўгасны дырэктар, афіцэр КДБ таксама інтэграваны ў намэнклятурную алігархію, таксама мае свой пералік табу і вызначаныя межы. Захавалася магнітафонная стужка, якую вынесьлі два гады таму з паседжаньня Магілёўскага вабласнога кіраўніцтва, дзе выступаў старшыня камісыі па барацьбе з карупцыяй Аляксандар Лукашэнка. Журналістаў туды не пускалі. Вось невялічкі фрагмэнт: "...Ставки очень большие. Речь идёт о власти, которую мы завтра, легонечко и спокойно можем в папочки сложить ровненько и положить тем людям, которые у власти и близко не должны быть... Поэтому я убедительно вас прошу, уважаемые товарищи, чтобы ваши фамилии нигде не шумели и не кричали. Это моя родная область... Вы ж поймите, что эта информация просачивается в комиссию... Мы возьмем под крышу то или иное дело, того или иного работника, чтобы, не дай Бог, завтра ему не пришлось расплачиваться благополучием своей семьи... Чтобы вы не беспокоились, что там комиссия, знаете, начнёт ловить акул. МЫ НИКАКИХ АКУЛ ЛОВИТЬ НЕ НАМЕРЕНЫ!..." І сапраўды, акулаў Ал—р Л—ка ня стаў лавіць не тады не цяпер. Намэнклятура, якая была ўзьняла пярэпалах пасьля яго абраньня, хутка супакоілася, а неўзабаве і перасела ў фатэлі прэзыдэнцкае вэртыкалі. Катэджы як стаялі, так і стаяць на мейсцы. Паказальных працэсаў народ не дачакаўся. Калі ўжо працягваць аналёгію з Францыяй, то гэтак жа ў свой час Напалеён абвесьціў амністыю раялістых і навербаваў зь іх ударны афіцэрскі корпус, узяў у галоўныя дарадцы Талейрана, а супроць былых паплечнікаў — рэвалюцыянэраў ушчаў жудасны тэрор. Калі ня браць пад увагу маштабы асобаў, то ў астатнім такія гістарычныя паралелі выглядаюць апраўданнымі. Вось як ацэньвае Л—ку ягоны колішні супернік па прэзыдэнцкай кампаніі, а цяпер кіраўнік гарадзенскай вобласьці сп.Дубко: "...Хорошо, что Л—ка пришел к власти с его нордическим характером. И мне приятно уважать человека, у которого характер тверже, чем у меня...". Указаньне на нардычнасьць характару навявае на яшчэ якія—кольвек гістарычныя паралелі, толькі ўжо зусім ня з Францыяй. Ясная рэч, што абласканыя прэзыдэнтам намэнклятура нахвальвае свайго карміцеля. Нават міністар працы сп.Сасноў, які ніколі раней ня быў у камандзе прэзыдэнта, а нават наадварот непрацяглы час уваходзіў у ценявы габінэт БНФ,

прыжыўшыся ў калідорах улады, вельмі асьцярожны цяпер у выказваньнях і ацэньвае пражыты пры прэзыдэнце год так : "Год быў вельмі цяжкі... Ёсьць аб'ектыўныя абставіны, якія ня здолее пераадолець ня толькі прэзыдэнт, але і нехта іншы. Грамадзтва павінна было прайсьці скрозь гэтыя цяжкія выпрабаваньні і зьмяніць нешта хутка немагчыма. Што дачычыць прэзыдэнцтва як інстытута, то я як раней, так і зараз застаюся з той думкай, што трэба было ўсёж—такі абыйсьціся без прэзыдэнцтва. Ёсьць складанасьці ва адносінах паміж уладамі і нашае грамадзтва яшчэ ня звыкла з гэтым. Тое, што рэформы ідуць, сумневу няма, але ідуць яны вельмі марудна. Лічу, што ў гэтым павінна так званая грамадзкая думка перш за ўсё. Людзі яшчэ не гатовыя ўспрыймаць навіну, не гатовыя працаваць у тых абставінах, якія трэба. Таму яны чапляюцца за старое, большасьць зь іх лічаць, што калі нічога не мяняць... — то гэта добра. Але гэта ня так...". Калі нічога не мяняць, дык і сапраўды дрэнна. Гэткай думкі прытрымліваецца, бадай, і прэзыдэнт. Таму і прапанаваў народу зьмены, няхай хаця б і на ўзроўні сымболікі. Прадстаўнікі мастацкае інтэлігенцыі ацэньваюць прэзыдэнта зусім іначай, чым міністар. Гаворыць Рыгор Барадулін: "Сказаць я нічога вясёлага не магу... Пра нашых уладных прынцаў, канкрэтна пра прэзыдэнта, які пра сябе гаворыць у трэцьцяй асобе, намякаць — што іх цікавіць культура — наіўна і недарэчна... Калі камуністам былі патрэбны адзнакі культуры, абмежаваныя ідэалягічнай цэнзурай, то гэтым культура толькі замінае. Фактычна задушана беларускамоўнае кнігадрукаваньне. Усё нацыянальнае нішчыцца эканамічна структурамі, якія практычна адмываюць грошы КПСС—КПБ. Нэакамуністы апошляць любое цывілізаванае паняцьце. Тое атрымалася і з пасадай прэзыдэнта, якая ў такім варыянце Беларусі не патрэбна. Гэта шаржыраваны варыянт былога першага сакратара ЦК КПБ. Гэта тэатар абсурду, калі прэзыдэнт хай умоўна незалежнай краіны выступае супроць мовы, якая акрэсьлівае дзяржаву ў сьвеце. Гэта — цырк на дроце — ды і годзе..."

Тое, што міністар асьцярожнічае, а прадстаўнік мастацкае інтэлігенцыі нездаволены прэзы-дэнтам — не адкрыцьцё. Таксама асьцярожна ацэньваюць дзейнасьць прэзыдэнта і бізнэсмэны. Тым цікавей будзе даведацца пра меркаваньне старшыні Беларускага фінансовага саюзу Натальлі Шаўко. Яна з таго рэдкага на Беларусі тыпу бізнэсмэнаў, якія не баяцца казаць тое, што яны думаюць. І хаця фінансава—інвэстыцыйная кампанія "ФІКо" пад кіраўніцтвам сп-ні Шаўко не паменшыла аб'ёмы сваёй дзейнасьці нават у такі неспрыяльны для бізнэсу час, яна сьцьвярджае: "Інвэстыцыйная актыўнасьць увогуле зараз у галіне адмоўных лічбаў, бо заходнія інвэстары спрабавалі рабіць якія—небудзь крокі на шляху інвэсты-цый, мы спрабавалі рабіць крокі па прыцягненьню інвэстыцыяў... Але ўсе гэтыя зьмены — то прэзыдэнкія ўказы, то забарона інвэстфондаў, то забарона працы з прыватызацыйнымі чэкамі — практычна ўсё гэта спыніла інвэстыцыйную дзейнасьць і з кожным днём усё болей нагадвае заходнюю мадэль усходняга кітайскага камунізму. Зараз прадпрымальніцтва дайшло да лініі, якую заступаць нельга... Цяпер менавіта той час, калі прадпрымальнікі павінны адстойваць сваю пазыцыю, таму што мы ня ворагі народу, мы жывем у гэтай краіне, мы працуем на гэту краіну і гэты народ. Зараз, калі 65% бюджэту Менска складаецца са сродкаў не ад дзяржаўнага сэктара. Разьвіцьцё нацыянальнага бізнэсу зьвязана з разьвіцьцём нацыянальнае эканомікі, а яна зараз — увасабленьне канцэпцыі прэзыдэнта, якога абраў народ. Я так думаю — хай народ ставіць адзнакі той лініі, якую праводзіць прэзыдэнт, а мы будзем разьвівацца разам з народам...".

Ну што ж, народ (калі меркаваць па выніках рэфэрэндуму) пакуль ставіць высокую адзнаку дзейнасьці "всенародно избранного", нягледзячы на досыць пэсымістычную ацэнку вынікаў працы ураду Л-кі ў сацыяльнай сфэры, якую даў эканамічны аглядальнік Беларускае службы РС прафэсар Уладзімер Кулажанка:
"... На ТБ прэм'ер—міністар Чыгір заявіў як аб вялікім посьпеху, што заработная плата работнікаў і служачых вырасла ў валютным эквіваленьце з 25$ у студзені да 64$ у чэрвені г.г. Але ён не сказаў, па—першае, пра падвышэньне цэнаў наогул і, у прыватнасьці, пра тое, што яны ў нас дасягнулі (а па некаторых харчовых таварах нават пераўзышлі) сусьветны ўзровень. І гэта пры адставаньні па сярэдняй зарплаце ад заходніх стандартаў у дзесяткі разоў! Уважлівых людзей зьдзівіла сэнтэнцыя прэзыдэнта Л—кі, што пагаршэньне жыцьцёвага ўзроўню народу зьвязана з тым, што, маўляў, незалежнасьць Беларусі дарагая рэч, за яе трэба плаціць, плаціць поўнасьцю Расеі за газ, нафту і сыравіну... Няўжо калі—небудзь наш край атрымоўваў іх дарэмна? Дзе спажывалася 40% нацыянальнага даходу рэспублікі, якія праз падаткі і кошты забіраў СССР штогод на працягу дзесяцігодзяў (гэта прыкладна 1млрд. $ за год). Чаму нам не палягчэла зараз, калі прэзыдэнт дамогся мытнага зьвязу з Расеяй? Рэч у тым, што там энэрганосьбіты падаражэлі спачатку года удвая і хутка мы будзем плаціць сусьветныя цэны дзе б іх не куплялі. Ці варта ілюзыі ўзводзіць у ранг ісьціны? Няма чаго хваліцца і перадоленьнем інфляцыі беларускага рубля, калі фінансы прадпрыемстваў знаходзяцца ў стане бедства. Шумная кампанія вакол пагашэньня неплацяжоў правалілася. Да канца чэрвеня ўзаемаразьлікі па даных Нацыянальнага банку Беларусі ажыцьцёўлены на суму 14 млрд. руб, тады як неплацяжы, паводле інфармацыі сп.Багданкевіча, складаюць 30 трлн. (!!!) руб, што болей гадавога валавага прадукта. Якая можа быць надзея на штучное пераадоленьне інфляцыі, калі з пачатку бягучага году грашовая эмісыя склала ў краіне 5 трлн. руб? Як сказаў старшыня Нацбанку, што адносна эканомікі ён ня бачыць падставаў для аптымізму на бліжэйшыя месяцы... Маладая адміністрацыя вядзе эканоміку не да рынку, а да азіяцкага шляху, але і там (напрыклад у Кітае) 50% прыватнага сэктару і менавіта ён забясьпечвае магутны рост. А дзяржаўны сэктар, як і у нас, толькі стрымлівае яго... Трэць дзяржаўных прадпрыемстваў у Кітаі сёньня стратныя. Без сумневу, што запазычаньне кітайскае мадэлі не прывядзе да росту беларускай эканомікі, бо ў нас няма прыватнага сэктару. Спроба паправіць становішча краіны за кошт ліквідацыі льготаў ды пазбаўленьня пэнсыянэраў мажлівасьці дадатковага заработку — нікчэмная надзея. Зьмяненьне толькі разьмеркавальных адносінаў нідзе не давала посьпеху...".

Алена Радкевіч запрасіла на "круглы стол" РС па тэмату ўгодкаў прэзыдэнцтва на Беларусі супрацоўніка Незалежнага інстытута палітычных і сацыяльна—эканамічных дасьледваньняў Юрыя Дракахруста (Менск, далей — Ю.Д.) ды рэдактара газэты "Наша Ніва" Сяргея Дубаўца (Вільня, далей

— С.Д.), ведамых аналітыкаў бягучае палітычнай сытуацыі. Прапануем Вашае ўвазе частку абмеркаваньня, якое прагучала на хвалях Беларускае праграмы РС у праграме "Праскі акцэнт".

Ю.Д. — У Л—кі ёсьць нейкае ўяўленьне пра Беларусь, нельга сказаць, што ён адчувае сябе нейкім правінцыйным расейскім губэрнатарам. Калі я размаўляў зь ім год таму за дзень да другога тура прэзыдэнцкіх выбараў, то спытаў наконт незалежнасьці. Ён мне адказаў у тым сэнсе, што, безумоўна, незалежнасьць павінна быць, таму што павінен быць нехта, хто б тварыў дабро свайму народу. Вось такі ў яго шлях прызнаньня дзяржавы, ня праз нацыянальную культуру, а менавіта праз этатызм. Л—ка хутчэй за ўсё хоча быць царом. Воля да ўлады ў яго вельмі моцная. Але варыянт наконт таго, каб стаць царом у Крамлі... Магчыма, ён усёж—такі зразумее, што гэтая гульня беспэрспэктыўная для яго. Зараз ГАРАНТЫЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ Беларусі — ЛУКАШЭНКА. Калі б ён цяпер паставіў пытаньне аб палітычным узьяднаньні Беларусі а Расеі на рэфэрэндуме, то атрымаў бы адказ: "Так".

С.Д. — Безумоўна, я цалкам згодны. Думаю, што мадэль ў яго дзейнасьці такая самая як была ў свой час, калі ён узяў досыць адсталы саўгас і вывеў яго ў перадавыя, за што атрымаў ухвалу Гарбачова. Цяпер ён узяў досыць асталую краіну, чаму яе ня вывесьці ў перадавыя — побач з Кітаем (куды ён так любіць езьдзіць)? Тут наўрад ці прысутнічае жаданьне быць царом альбо такі фэтыш, як шалёная любоў да ўлады. У яго палітыцы зусім адсутнічае мэтафізычны момант, ён падыходзіць да ўсяго як прагматык і разглядае палітыку як творча—вытворчыя адносіны, скажам — як паміж заводамі ды прадпрыемствамі.

А.Р. — Дык Вы ўсёж—такі лічыце, што лукашэнкаўская звышідэя ды звышмэта — дабрабыт Беларусі, што ён патрыёт сваёй краіны і, зрэшты, што ягонае зьяўленьне на гэтым этапе ў гісторыі — зьявішча лягічнае, заканамернае ды, як я зразумела з Вашых словаў, — станоўчая?

